**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь узорны ансамбль танца «Дружба» Культурна-спартыўнага комплексу РУП «Гомельскае аддзяленне Беларускай чыгункі»**

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль танца «Дружба» з'яўляецца пастаянна дзеючым калектывам мастацкай самадзейнасці, які быў заснаваны ў 1947 годзе. Легендай стварэння і развіцця ансамбля стаў Аляксандр Аляксеевіч Рыбальчанка – народны артыст БССР, першы ганаровы грамадзянін горада Гомеля сярод творчай інтэлігенцыі, ветэран Вялікай Айчыннай вайны; галоўны балетмайстар беларускай дэлегацыі на Міжнародным фестывалі моладзі і студэнцтва ў Маскве (1957 год); пастаноўшчык першага ў Гомелі свята песні і танца. Менавіта яму належала ініцыятыва стварэння дзіцячай танцавальнай групы пры дарослым ансамблі песні і танца ў Палацы культуры чыгуначнікаў імя У.І. Леніна.

У 1952 годзе творчыя абставіны склаліся так, што ансамбль узначаліла натхнёная харэаграфічнай школай А.А. Рыбальчанкі таленавітая дзяўчына Тамара Георгіеўна Коўжун. Яна ўдыхнула новае жыццё ў «Дружба», уклаўшы ўсю сваю энэргію ў тое, каб калектыў выйшаў на новы прафесійны ўзровень і дасягнуў прызнання гледача. Танец стаў для яе справай усяго жыцця. Кожны харэаграфічны здабытак быў напоўнены жыццём і любоўю да чалавека, да сваёй Айчыны.

З павагай і гонарам можна гаварыць пра таленавітага кіраўніка «Дружба». Дзякуючы яе настойлівасці і працавітасці, дзіцячы танцавальны калектыў працягваў жыць і ствараць новае. Выступаючы на многіх канцэртных пляцоўках горада і вобласці, прадпрыемствах Гомельскага аддзялення Беларускай чыгункі, дзіцячы ансамбль стаў вядомы сваім рэпертуарам і сцэнічнай культурай. Так, «Дружба» знакаміта сваімі маштабнымі творамі харэаграфічнага мастацтва: «Палёт у космас», «Дзеці блакітнай планеты», «Героі грамадзянскай вайны», «Піянеры – героі Айчыннай», «Наш двор», «Мая мара пра флот», «Чапаеўцы», «Партызанскія дзеці», сюіта «Сяброўкі»; танцы «Лянок», «Бульба», «Чарот», «Завіруха».

Палову стагоддзя ўзначальваючы «Дружба» са дня ў дзень дбайна і цярпліва адточваючы майстэрства сваіх падначаленых, Тамара

Георгіеўна перадае кіраўніцтва калектывам Алене Цімашэнка. І з 2003 года (па сённяшні час) мастацкім кіраўніком і балетмайстарам харэграфічнага калектыву з'яўляецца Алена Іванаўна Цімашэнка. Безумоўна, школа жыцця, а галоўнае падтрымка з боку Тамары Георгіеўны, адыгралі не малую ролю ў станаўленні прафесіянальнага педагога і арганізатара, пастаноўшчыка і мастака сцэнічных касцюмаў. Маючы выдатныя здольнасці, творчае мысленне, музыкальны і мастацкі густ, А.І. Цімашэнка, не парушаючы стыля «Дружба», стварае свае асабістыя пастаноўкі. Яна працягвае традыцыі А.А. Рыбальчанкі і Т.Г. Коўжун, узорам чаго з'яўляецца харэаграфічная замалёўка «Козачкі», харэаграфічная кампазіцыя «Дранікі-бульбянікі», «Руская-дзявочая» і іншыя. Іх можна лічыць новым словам у біяграфіі калектыву. Цімашэнка пашырае праграму «Дружбы», звяртае ўвагу на выразнасць выканаўчага майстэрства «праз цела», суадносячы тэхніку з унутранай натхнёнасцю выканаўцаў.

У калектыве займаецца больш за 100 чалавек ва ўзросце ад 4 да 20 гадоў. У ансамблі дзейнічае тры ўзроставыя групы: малодшая, сярэдняя, старэйшая.

Калектыў адрозніваецца прадуманасцю выбару музычнага матэрыялу, пошукам уласнага харэаграфічнага почырку, разнастайнасцю рэпертуару. Пры падборы рэпертуару кіраўнік ансамбля выкарыстоўвае этнаграфічную літаратуру, матэрыял з семінараў-практыкумаў, методыку выкладання народна-сцэнічнага і класічнага танцаў, гісторыю балетнага мастацтва, асновы сучаснай харэаграфіі і напрацоўкі вядучых ансамбляў танцаў Рэспублікі Беларусь.

Дзякуючы людзям-легендам А.А. Рыбальчанка, Т.Г. Коўжун, а таксама Цімашэнка сённяшні ўзровень «Дружбы» вельмі высокі. Трэба падкрэсліць, што гэта калектыў не толькі народнага танца, а «спляценне» традыцый двух напрамкаў: народна-сцэнічнага танца і сучаснай харэаграфіі. Гэта калектыў з новай мастацкай канцэпцыяй, які не баіцца смелых эксперыментаў і рухаецца заўсёды наперад. Асноўны прынцып работы калектыву – зберажэнне і працяг лепшых традыцый; задача – «адзінства душэўнай і ўнутранай прыгажосці танцора». «Галоўнае – дабіцца таго стану, калі «цела пачынае дыхаць». Напоўніць кожны танец жывым дыханнем, стварыць на сцэне гармонію танца і

цела – вось асноўнае, што неабходна для кожнага танцора» – адзначае кіраўнік.

У рэпертуары ансамбля больш за 20 самастойных харэаграфічных пастсановак і кампазіцый – гульнявыя, сюжэтныя, тэматычныя, аўтэнтычныя беларускія народныя танцы, тэматычныя і харэаграфічныя замалёўкі, класічныя эстрадныя танцы. Калектыў кожны год прымае ўдзел у розных мерапрыемствах, сярод якіх сумесныя выступленні з музыкантамі

ДУ «Гомельскія гарадскія аркестры», салістамі аркестра, а таксама запрошанымі гасцямі А. Рыбаком (Нарвегія), Дзмітрыем Даніленка (Расія), Егіазарам Фарашанам, музыкантамі эстрадна-сіфанічнага аркестра Гомельскай абласной філармоніі і салістамі аркестра, народным арцістам Беларусі Мікалаем Скорыкавым (праект «Залатая калекцыя беларускай песні»), Заслужанай артысткай Беларусі Ірынай Дарафеевай (праект Беларускай федэрацыі прафсаюзаў «Нашы таленты цябе, Беларусь!»), народным артыстам Беларусі, мастацкім кіраўніком ансамбля «Сябры» Анатолем Ярмоленка і артысткай маладзёжнага тэатра эстрады Вікторыяй Алешка (канцэрт, прысвечаны юбілею города Гомеля, акцыя Беларускай федэрацыі прафсаюзаў «Мы – разам!»), выступленне у канцэртнай праграме Анастасіі Валачковай (Расія) і гэтак далей.

